# ВАЕННАЕ ЛІХАЛЕЦЦЕ У ЛЁСЕ МАЁЙ СЯМ'І

Тарасюк С. А.
Навуковы кіраўнік: ст. выкладчык Дайняк А.М.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

## Старас Казіміра Вацлаваўна

Распачаць сваё даследаванне я вырашыў з успамінаў старэйшага прадстаўніка майго роду па матулінай лініі – прабабулі Старас (у дзявоцтве Лойка) Казіміры Вацлаваўны.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, маёй прабабулі было ўсяго восем год, але яна вельмі добра памятае той час, бо дзяцінства яе скончылася менавіта тады. Дзеці разам з бацькамі мужна перажывалі ўсе нягоды ваеннага ліхалецця. Яны спазналі голад, акупацыю, бамбёжкі, перажылі ўсе жахі тых крывавых гадоў, і гэты час пакінуў ім незагойныя раны. Пакаленне таго часу было "асуджана" на вайну. Цяжкія часы перажылі дзеці вайны.

## Лойка Павел Іванавіч

Нарадзіўся Павел у вёсцы Тартакі цяперашняга Баранавіцкага раёна ў простай, беднай сям'і. Павел Іванавіч – сын Лойка Івана Сямёнавіча і Лойка Валерыі, дзядзька маёй прабабулі Старас (Лойка) Казіміры Вацлаваўны. Калі пачалася Другая сусветная вайна яму было 15 гадоў. Разам з сям'ёй ён апынуўся ў ссылцы пад Архангельскам.

Павел Лойка ў 1942 г. вырашыў далучыцца да арміі Андэрса. Яму было 16 гадоў, ён дабавіў сабе некалькі год. Паколькі пры фарміраванні дадзеныя часткі адчувалі востры недахоп ва ўзбраенні і харчаванні, 18 сакавіка 1942 г. савецкі ўрад пагадзіўся на прапанову польскага боку аб вывадзе польскіх частак праз Іран на Блізкі Усход для далейшага забеспячэння іх заходнімі саюзнікамі. Там фарміраванне было перайменавана ў 2-гі польскі корпус. Так у 1942 г. Павел трапіў у Ірак, пазней у Палестыну, дзе прайшоў ваенныя курсы і трапіў у польскую 3-ю Карпацкую стралковую дывізію, пасля чаго апынуўся на Заходнім фронце.

У верасні 1943 г. войскі саюзнікаў высадзіліся ў Італіі, на шляху іх руху да Рыма стаў горны масіў Монтэ-Касіна. Бункеры і іншыя ўмацаванні, якія знаходзіліся на яго схілах, давалі горным часткам вермахта магчымасць выдатна кантраляваць подступы да сталіцы Італіі. А на вяршыні гары высіўся непрыступны бастыён — тысячагадовы манастыр. Авалодаць горным масівам не ўдавалася. У ноч з 11 на 12 мая 1944 г. быў прызначаны штурм Монтэ-Касіна. Для яго выкарыстоўвалі 2-гі польскі корпус генерала

Андэрса, які ў той час налічваў 47 тысяч салдат і афіцэраў, большасць з іх прайшла навучанне ў Савецкім Саюзе.

У бітве ля Монтэ-Касіна загінулі 924 салдаты корпуса Андэрса, у іх ліку 180 воінаў з Беларусі. Усе яны былі пахаваны на асобных Польскіх ваенных могілках каля манастыра, дзе быў усталяваны мемарыял [4]. Павел Лойка быў паранены.

Сотні нашых суайчыннікаў за адвагу, самаахвярнасць і гераізм атрымалі Памятны крыж Монтэ-Касіна. Яшчэ 80 выхадцаў з Беларусі ўдастоіліся гонару атрымаць вышэйшую польскую воінскую ўзнагароду — Крыж Храбрых, 45 чалавек — Сярэбраны крыж Заслуг з мячамі, а сямёра — Залаты крыж Заслуг. Мой прапрадзед аказаўся ўнікальным чалавекам — ён быў узнагароджаны Залатым крыжом Заслуг і Сярэбраным крыжом Заслуг з мячамі

У 1946 годзе Павел Лойка трапіў у 2-ую танкавую дывізію, у складзе якой апынуўся ў Англіі. Дывізія падпарадкоўвалася 8-й брытанскай арміі. У 1947 г. ён быў звольнены з Войска Польскага. 14 чэрвеня 1947 года эмігрыраваў у Канаду, дзе застаўся назаўсёды.

## Раманка Канстанцін Ільіч

Мой прадзед па матулінай лініі, Канстанцін Ільіч, нарадзіўся ў вёсцы Спачынак цяперашняга Баранавіцкага раёна ў сям'і сялян Раманкаў Ільіча і Марыі ў 1909 годзе.

18 жніўня 1944 года Канстанцін быў прызваны ў армію. Перапраўляўся праз раку Нісу, якая знаходзіцца ў Польшчы. 24 кастрычніка 1944 года перапраўляўся праз раку Одэр у Германіі. Са слоў майго дзядулі, ў гэтай пераправе ўдзельнічала 120 чалавек і толькі 17 засталіся ў жывых, у тым ліку і мой прадзед. Менавіта тады ён быў кантужаны, апынуўся ў шпіталі. Пасля збег далей змагацца з ворагам. Прадзед удзельнічаў у баях пад Кёнігсбергам.

## Саўчук Іван Міхайлавіч

У гады Вялікай Айчыннай вайны спраў хапала ўсім. Акрамя тых, хто здабываў Перамогу на франтах, былі тыя, хто дапамагаў набліжаць яе ў тыле. Такім у маёй сям'і быў мой прапрадзед Саўчук Іван Міхайлавіч – прадзед майго таты.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі пачаў разгортвацца партызанскі рух. У другой палове 1942 г. у Баранавіцкай вобласці дзейнічалі 32 партызанскія атрады. Праз лінію фронта ў 1943 г. для кіраўніцтва партызанскім рухам быў накіраваны Баранавіцкі абкам партыі на чале з В.Я. Чарнышовым. Абкам друкаваў газету "Чырвоная звязда". 1

верасня 1942 г. быў створаны атрад “Савецкая Беларусь”. Узначаліў атрад М.У. Бабкоў. Перад атрадам ставілася задача праводзіць аперацыі па падрыву варожых эшалонаў, вядзенню разведкі, дастаўцы боепрыпасаў. Агульнымі намаганнямі народныя мсціўцы ліквідавалі значную частку паліцэйскіх участкаў, дробных гарнізонаў праціўніка. Партызаны сталі сістэматычна наносіць удары па чыгунцы і шашэйных дарогах, што значна падрывала транспартныя магутнасці, парушала планавыя перавозкі ваенных грузаў на фронт. З другой паловы 1943 г. партызаны ўзмацнілі свае баявыя дзеянні на дарогах. Стаяла агульная задача – па магчымасці як мага болей зрываць транспартныя перавозкі ворага, якія ішлі з захаду на ўсход. Партызаны бліскуча справіліся з гэтай задачай. Дыверсійна-падрыўныя групы атрада “Савецкая Беларусь” у перыяд з кастрычніка 1943 г. да 20 ліпеня 1944 г. падарвалі 115 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, іншымі ваеннымі грузамі, знішчылі 9 аўтамашын, разбурылі 59 км сувязі, пашкодзілі 7 паравозаў, 25 чыгуначных ліній, падчас крушэння эшалонаў было знішчана 163 гітлераўцы. Пад аховай атрадаў брыгады імя П.К. Панамарэнкі была праведзена сяўба ў 1944 г. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, больш за 500 партызанаў Брэсцкага злучэння былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Мой прапрадзед дапамагаў партызанам тым, што даваў ім каштоўныя звесткі аб перамяшчэнні нямецкіх войск, аб чым сведчыць характарыстыка, выдадзеная Івану Міхайлавічу партызанамі Круглікам І.Р., Тарасюком І.П., Самсонікам У.У., Прусевічам А.М., Чэчатам Р.А. У характарыстыцы пісалася, што “Саўчук Іван Міхайлавіч у 1942-1943 гг. працаваў на шашы ў якасці рабочага, быў звязаны з партызанскім атрадам, і даваў каштоўныя звесткі пра перамяшчэнне нямецкіх узброеных сіл па шашы Слонім–Баранавічы, дзе закладваліся міны, каб замарудзіць рух фашысцкіх аўтамашын. Таксама ўдзельнічаў у ліквідацыі прышашэйных тэлефонных ліній сувязі. Акрамя гэтага, Саўчук аказваў партызанам дапамогу ў забеспячэнні харчаваннем, адзеннем і неабходнымі медыкаментамі. Паведамляў звесткі аб знаходжанні нямецкіх боепрыпасаў, за што падвяргаўся катаванням нямецкіх карнікаў”.

Яго жонка Аляксандра у час вайны пякла партызанам хлеб, мыла бялізну, дапамагала лекавымі травамі змагацца з хваробамі.

Няўмольны час усё больш сцірае ў памяці жывучых вобраз мінулага. Успаміны і фотаматэрыялы дапамагаюць нам аднавіць аблічча эпохі, стварыць малюнак жыцця нашых продкаў.

## Спіс літаратуры

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пружанскага р-на / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал. І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш.; Маст. А. М. Хількевіч. — Менск: БелЭн, 1992. — 452 с.: іл.
2. Поляки в России: XVII-XX вв.: Материалы Международной научной конференции / Изд-во "Кубанькино". Краснодар, 2003. 340 с.
3. Беларусы у бітве за Монтэ-Касіна — Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004.


## УВЕКОВЕЧИВАНИЕ ПАМЯТИ О ГЕНОЦИДЕ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА В ПЕРИОД ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ


Щерба М.Е.
Научный руководитель: ст. преподаватель Дайняк Е.Н.
Белорусский национальный технический университет


Великая Отечественная война стала самым трагическим эпизодом в истории Беларуси, приведя к гибели каждого третьего белоруса и осуществлению геноцида против мирного населения. Политика геноцида привела к разрушению тысяч деревень, созданию лагерей смерти и гетто, а также к массовым расстрелам и насилию против мирного населения.

Понятие "геноцид" было введено польско-американским юристом Рафаэлем Лемкиным и получило юридическое признание в 1945 году, что позволяет рассматривать действия нацистов в Беларуси как геноцид.

Зверства нацистов не соизмеримы, невозможно подсчитать ни физический ущерб, ни масштаб нанесенных моральных страданий. Все, что подвластно в настоящий момент потомкам – сохранить и передать память о боли белорусского народа, имя которой геноцид.

Сохранение исторической памяти о геноциде способствует реализации перечня функций, среди которых формирование национальной идентичности, предупреждение повторения, дань уважения жертвам геноцида, укрепление демократии и развитие критического мышления у потомков.

Таким образом, сохранить историческую память о совершенных злодеяниях – значит извлечь уроки из истории, не допустить ее повторения, но также и отстоять независимость и суверенитет Беларуси. Сохранение исторической памяти о геноциде способствует формированию национальной идентичности и созданию ощущения единства в народе. Осознавая трагедию прошлого, можно предугадать и предотвратить возможность ущемления прав и свобод людей.

В целях повышения уровня осведомленности граждан о геноциде народа, а также формирования традиции сохранения памяти о невинных